# Вялікая Воля

## Вялікая Воля

Да вайны ў вёсцы  было 104 двары, пражывала 430 чалавек. Людзі працаздольнага ўзросту займаліся жывёлагадоўляй і раслінаводствам, добра былі развіты хатнія промыслы. Восенню 1942 года гітлераўцы пачалі наступленне на Ліпічанскую пушчу. Немцы наступалі з трох бакоў, маючы намер прыціснуць партызан да Нёмана. Завязаліся цяжкія баі.

Адзін з іх завязаўся ў раёне вёскі Вялікая Воля. Ён працягваўся з раніцы да позняй ночы. Часам здавалася, што гітлераўцы вось-вось прарвуцца праз Шчару, але кожны раз становішча выратоўваў бронеатрад.

12 снежня партызаны пакінулі Вялікую Волю. Сюды прыйшлі немцы. У сярэдзіне дня акупанты загадалі  вяскоўцам сагнаць усю жывёлу ў прызначанае месца.  Калі загад быў выкананы, гітлераўцы вылучылі дваццаць восем мужчын, якія павінны былі гнаць жывёлу ў Казлоўшчыну.

Да вайны ў вёсцы  было 104 двары, пражывала 430 чалавек. Людзі працаздольнага ўзросту займаліся жывёлагадоўляй і раслінаводствам, добра былі развіты хатнія промыслы. Восенню 1942 года гітлераўцы пачалі наступленне на Ліпічанскую пушчу. Немцы наступалі з трох бакоў, маючы намер прыціснуць партызан да Нёмана. Завязаліся цяжкія баі.

Адзін з іх завязаўся ў раёне вёскі Вялікая Воля. Ён працягваўся з раніцы да позняй ночы. Часам здавалася, што гітлераўцы вось-вось прарвуцца праз Шчару, але кожны раз становішча выратоўваў бронеатрад.

12 снежня партызаны пакінулі Вялікую Волю. Сюды прыйшлі немцы. У сярэдзіне дня акупанты загадалі  вяскоўцам сагнаць усю жывёлу ў прызначанае месца.  Калі загад быў выкананы, гітлераўцы вылучылі дваццаць восем мужчын, якія павінны былі гнаць жывёлу ў Казлоўшчыну.

Але самае жахлівае іх  чакала наперадзе.16 снежня 1942 г. фашысты  пачалі ўрывацца ў хаты, выганяць людзей на вуліцу  і  пад канвоем зганяць на плошчу да царквы. Вяскоўцаў сталі дзяліць на дзве групы. Адлічыўшы чалавек сто пяцьдзесят ад калоны, карнікі

загадалі ім стаяць на месцы, а астатніх павялі далей. Як толькі калоны схаваліся за паваротам, групу вялікавольцаў павялі праз шашу да гары, якую называлі Высокія Магліцы. Людзі жахнуліся. Перад гарой былі ўстаноўлены тры кулямёты.

3 даўніх часоў ля Высокіх Магліц бралі пясок. Тут утварыўся вялікі роў. Людзей пачалі заганяць у гэты роў і класці ніцма адзін да аднаго.

16 снежня 1942 года ў вёсцы Вялікая Воля было спалена 104 дамы, забіта 364 чалавека. У памяць аб загінуўшых у 1961 годзе каля вёскі быў узведзены помнік.



Ля помніка ахвярам Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы Вялікая Воля

# Малая Воля

# Малая Воля

Вёска Дзянісаўскага сельсавета. 45 гаспадарак, 69 жыхароў (1996 г.).

У 1905 г. Малая Воля - вёска Пацаўскай вобласці, Слонімскага павета, Гродзенскай губерні (160 жыхароў). У 1940 г. - 75 двароў, 447 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. да 9.07.1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У сакавіку 1943 г. тут было спалена 58 двароў, загублена 28 жыхароў.

Да вайны ў вёсцы было 75 дамоў, у якіх пражывала 447 чалавек. Але 22 чэрвеня 1941 года мірнае жыццё для ўсіх закончылася. 17 снежня карнікі з'явіліся ў Малой Волі. Салдаты ўрываліся ў хаты і выкідалі людзей на вуліцу. Дарослым загадвалі браць з сабой рыдлёўкі. Малавольцы яшчэ не ведалі ўсёй трагедыі сваіх суседзяў, але прадчувалі, што карнікі зрабілі нешта нядобрае з жыхарамі Вялікай Волі. Па камандзе немца ў скураным паліто карнікі сталі дзяліць вяскоўцаў. У адзін бок - старых і малых, у другі - дарослых. Старых з дзецьмі адпусцілі, а дарослых з рыдлёўкамі пад канвоем пагналі ў Казённы лес на тое месца, дзе была ўчынена расправа над іх суседзямі.

Не даўшы апамятацца, карнікі аддзялілі мужчын ад жанчын. Мужчынам загадалі капаць вялікую яму. У каго не было рыдлёвак, тых салдаты прымусілі зносіць трупы да ямы. Жанчынам далі «лягчэйшую работу» - закідаць зямлёй яму з трупамі.

У той жудасны дзень было забіта 32 чалавекі, зруйнавана 58 дамоў.

На сучасны час вёска Малая Воля ўзноўлена. Старастам вёскі з'яўляецца Павачка Дар'я Сямёнаўна, былая настаўніца Малавольскай васьмігадавой школы. За сваю актыўную жыццёвую пазіцыю, жаданне дапамагчы кожнаму аднавяскоўцу Дар'я Сямёнаўна заслужыла вялікі аўтарытэт і павагу.


На гэтым месцы 16 снежня 1942 года
нямецка фашысцкімі карнікамі
расстраляны 364 мірныя жыхары
вёскі Вялікая Воля

Трахімавічы

**Трахімавічы**

Да вайны ў вёсцы Трахімавічы было 23 дамы, у якіх пражывала 165 людзей. Прыкладна за кіламетр ад вёскі, у хваёвым бары, размяшчаўся партызанскі атрад. Партызаны, вядома не давалі спакою “новым уладам”. Па розных патрэбах яны часта наведваліся ў Трахімавічы, дзе ведалі многіх жыхароў, знаходзілі ў іх падтрымку. Праўда, вясковыя мужчыны ў партызанскім руху не ўдзельнічалі, мірна працягвалі працаваць на зямлі.

У час наведвання Дзятлаўскага гісторыка-краязнаўчага музея мы знайшлі запіс успамінаў старэйшай жыхаркі вёскі Юзэфы Францаўны Трахімовіч, якая з’яўлялася сведкай той далёкай трагедыі

13 снежня 1942 г. З ранку ў вёску прыехалі карнікі. Я ўсё помню да дробязей, быццам гэта здарылася ўчора. Дык вось, у той дзень, а гэта была нядзелька, ля вёскі засела некалькі партызан, якія адкрылі агонь па карніках. Завязаўся бой. Два партызаны былі забіты на месцы, акурат непадалёку ад брацкай магілы. Вось і вырашылі фашысты, што тут амаль усе партызаны.
Фашысты хутка акружылі вёску і пачалі выганяць усіх са сваіх хат – і старых, і дзяцей. Безумоўна, як не падпарадкуешся ўзброеным да зубоў фашыстам! Яны хутка сагналі ўсіх у адно месца. Спачатку хацелі загнаць у старую хату. Людзі туды не пайшлі – відаць, зразумелі, што спаляць. Тады, пад шчыльным канвоем, прывялі на бераг возера, што ля самай вёскі, устанавілі кулямёты. Два хлопчыкі гадоў пятнаццаці паспрабавалі ўцячы, але дзе там – іх дагналі кулі. Пачырванела вада ў возеры. Чуліся стоны яшчэ жывых людзей. Фашысты дабівалі іх. Праз некалькі дзён у вёску зноў прыехалі фашысты. На гэты раз яны забралі жывёлу і маёмасць, а дамы спалілі. У выніку гэтай трагедыі ўчалела толькі 9 чалавек”.

Населены пункт перастаў існаваць у выніку вялікага зладзейства карнага атрада.

У 2018 годзе ў вёсцы пражывае толькі 5 жыхароў. Усе яны з'яўляюцца пенсіянерамі. Жывуць паміж сабою вельмі дружна, дапамагаюць адзін аднаму па гаспадарцы. І вельмі часта прыходзяць да помніка загінуўшым землякам, каб ушанаваць іх памяць.



У час наведвання Дзятлаўскага гісторыка-краязнаўчага музея




Маршрут прывёў нашых краязнаўцаў у вёску Трахімавічы

# Дубароўшчына

**Дубароўшчына**

Дубароўшчына - вёска ў Казлоўшчынскім сельсавеце Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці. Плошча населенага пункта складае 19,06 га. Да вайны пражывала 215 чалавек. Жыхары займаліся сельскай гаспадаркай, рамёстамі. Людзі паміж сабой жылі дружна і ніхто з іх не ведаў тады, які лёс чакае іх наперадзе.

17 снежня 1942 года ў вёску Дубароўшчына прыехаў атрад немцаў прыкладна ў 150 чалавек. Яны спалілі 23 дамы і 46 надворных збудаванняў. Забівалі на месцы ўсіх, хто не паспеў уцячы. Усяго загінула 33 чалавекі, 5 чалавек арыштавалі, 5 – адвезлі на работу ў Германію.

На пачатак 2018 года ў населенным пункце пражываюць 14 жыхароў. 4 з іх – людзі працаздольнага ўзросту, а 10 жыхароў знаходзяцца на заслужаным адпачынку. Старастам вёскі з'яўляецца Чудзілоўская Ядвіга Бенедзіктаўна, якая паведаміла нам цікавыя звесткі пра сваю родную вёску. Нягледзячы на свой сталы ўзрост, Ядвіга Бенедзіктаўна праводзіць вялікую грамадскую работу сярод аднавяскоўцаў. У яе дом прыходзяць за парадай, за дапамогай і для ўсіх яна знаходзіць час і цёплыя словы падтрымкі.




Мы знаходзімся ў вёскі Дубароўшчына

Гарадкі

# Гарадкі

Да вайны ў вёсцы Гарадкі быў 51 дом, пражывала 385 чалавек.

Як маланка з яснага неба грымнула вайна. Пайшлі цяжкія,трывожныя дні. Паяўляліся ў вёсцы нямецка-фашыскія захопнікі, забіралі збожжа, жывёлу, здзекваліся над жыхарамі. Аднак сапраўдны звярыны твар яны паказалі 13 і 16 снежня 1942 года, калі ў 2 заходы знішчылі 48 двароў, расстралялі і спалілі жывымі 367 яе жыхароў .

Як гэта было, распавядала цудам Выжылая Ядвіга Гарадко. Яе ўспаміны захавайся ў кнізе "Памяць" Дзятлаўскага раёна:

- У вёску на машынах, з кулямётамі, аўтаматамі і сабакамі наляцелі карнікі. Солтысу Юзэфу Лагуціку загадалі сабраць усіх жыхароў з пашпартамі на краі вёскі. Па настроі карнікаў, якія рыхтуюць кулямёты, людзі адчулі нядобрае і сталі разбягацца. Але іх пераканалі, што з імі нічога не здарыцца, і многія вярнуліся на луг. Нам загадалі выстраіцца і ўзяць на рукі дзяцей. Галоўны па званні сказаў солтысу: "Ты быў добрым і немцам, і партызанам, атрымлівай плату" і... застрэліў яго. Пасля чаго аўтаматны і кулямётны агонь абрынуўся на нас. Людзі крычалі, плакалі, праклінaлі фашыстаў... праз некалькі хвілін усё абарвалася, сціхла, толькі чуліся стогны паміраюць. Я ляжала ніцма, прываленая трупамі і была яшчэ пры памяці, калі немец схапіў мяне за каўнер, перавярнуў і прама на мне забіў майго сыночка. Куля, якая яго працяў і прайшла навылёт, засела ў маіх грудзях.

Праз 3 дні, карнікі прыгналі людзей з навакольных вёсак, кія выкапалі вялікую магілу і захавалі аднавяскоўцаў.

Пасля вызвалення вёскі застаўшыяся ў жывых занава будавалі вёску.

На пачатак 2018 года ў вёсцы пражывае 15 жыхароў. 4 чалавекі з'яўляюцца людзьмі працаздольнага ўзросту. 10 жыхароў маюць пенсійны ўзрост. Асабліва прыемна, што ў 2017 годзе нарадзілася 1 дзіця. Старастам населенага пункта з'яўляецца ваенны пенсіянер Лагуцік Аляксей Адольфавіч. Гэты чалавек не можа сядзець без справы, таму што мае вельмі актыўную жыццёвую пазіцыю. Сярод аднавяскоўцаў карыстаецца вялікім аўтарытэтам і павагай.



У вёсцы Гарадкі у час размовы са старастай Заянчкоўскай Надзеждай Мікалаеўнай

**Гарадкі**

Да вайны ў вёсцы Гарадкі быў 51 дом, пражывала 385 чалавек.

Як маланка з яснага неба грымнула вайна. Пайшлі цяжкія,трывожныя дні. Паяўляліся ў вёсцы нямецка-фашыскія захопнікі, забіралі збожжа, жывёлу, здзекваліся над жыхарамі. Аднак сапраўдны звярыны твар яны паказалі 13 і 16 снежня 1942 года, калі ў 2 заходы знішчылі 48 двароў, расстралялі і спалілі жывымі 367 яе жыхароў .

Як гэта было, распавядала цудам Выжылая Ядвіга Гарадко. Яе ўспаміны захавайся ў кнізе "Памяць" Дзятлаўскага раёна:

- *У вёску на машынах, з кулямётамі, аўтаматамі і сабакамі наляцелі карнікі. Солтысу Юзэфу Лагуціку загадалі сабраць усіх жыхароў з пашпартамі на краі вёскі. Па настроі карнікаў, якія рыхтуюць кулямёты, людзі адчулі нядобрае і сталі разбягацца. Але іх пераканалі, што з імі нічога не здарыцца, і многія вярнуліся на луг. Нам загадалі выстраіцца і ўзяць на рукі дзяцей. Галоўны па званні сказаў солтысу: "Ты быў добрым і немцам, і партызанам, атрымлівай плату" і... застрэліў яго. Пасля чаго аўтаматны і кулямётны агонь абрынуўся на нас. Людзі крычалі, плакалі, праклiналі фашыстаў... праз некалькі хвілін усё абарвалася, сціхла, толькі чуліся стогны паміраюць. Я ляжала ніцма, прываленая трупамі і была яшчэ пры памяці, калі немец схапіў мяне за каўнер, перавярнуў і прама на мне забіў майго сыночка. Куля, якая яго працяў і прайшла навылёт, засела ў маіх грудзях.*

Праз 3 дні, карнікі прыгналі людзей з навакольных вёсак, кія выкапалі вялікую магілу і захавалі аднавяскоўцаў.

Пасля вызвалення вёскі застаўшыяся ў жывых занава будавалі вёску.

На пачатак 2018 года ў вёсцы пражывае 15 жыхароў. 4 чалавекі з'яўляюцца людзьмі працаздольнага ўзросту. 10 жыхароў маюць пенсійны ўзрост. Асабліва прыемна, што ў 2017 годзе нарадзілася 1 дзіця. Старастам населенага пункта з'яўляецца ваенны пенсіянер Лагуцік Аляксей Адольфавіч. Гэты чалавек не можа сядзець без справы, таму што мае вельмі актыўную жыццёвую пазіцыю. Сярод аднавяскоўцаў карыстаецца вялікім аўтарытэтам і павагай.

Дубраўка

**Дубраўка**

У вёсцы Дубраўка да вайны налічвалася 62 дамы, у якіх пражывала 279 чалавек. Людзі жылі, працавалі, наладжвалі святы, радаваліся жыццю. Усе верылі, што наперадзе яно будзе яшчэ лепшым. Але прыпыніла самая страшная вайна.

30 жніўня 1942 года 8-м карным атрадам з удзелам мясцовай паліцыі былі здзейснены злачынствы над жыхарамі вёскі Дубраўка.

***№ 126 Акт о сожжении немецкими оккупантами д. Дубровка Дятловского района и убийстве ее жителей***

*29 декабря 1943 г.*

*30.8.42 года 8-м карательным отрядом с участием местной полиции и украинцев совершены злодеяния над мирным населением деревни. Расстреляно строем 28 человек, сожжено в огне 10 человек, остальные расстреляны в домах, спрятавшиеся в ямах и погребах. Всего сожжено домов – 47, вместе с хлевами, гумнами и всем имуществом, забран весь скот, за исключением того, который погорел. В итоге совершенного злодеяния убито – 98 человек, увезено в Германию на каторжную работу – 22 человека. Участвовала местная полиция из м-ка Желудка, в частности: с дер. Яселевичи – Цыбульский и Ковалевский.*

*Председатель комиссии по*
*злодеяниям в Дятловском районе лейтенант*
*Смирнов*
*Члены: Старший сержант*
*Семенов*
*Сержант*
*Снытич*

У гэты дзень карнікі расстралялі 28 чалавек, спалілі ў агні 10 жыхароў, астатніх забілі ў хатах, ямах і пограбах, у якія хаваліся людзі. Усяго спалілі 47 дамоў, разам з гумнамі, прыбудовамі і астатняй маёмасцю. У людзей забралі ўвесь скот, за выключэннем

таго, які згарэў. За тры гады акупацыі  у вёсцы  было забіта 98 чалавек, вывезена ў Германію на катаржныя работы – 22 маладых жыхара. У карных аперацыях супраць мірнага насельніцтва ўдзельнічала мясцовая паліцыя з мястэчка Жалудок, у прыватнасці з вёскі Ясялевічы - Цыбульскі і Кавалеўскі.

На сённяшні час (2019г.) пражывае 21 жыхар.  8 чалавек  - працаздольнага ўзросту і 13 – пенсійнага.  Старастам вёскі з'яўляецца Заянчкоўская Надзежда Мікалаеўна, якая доўгія гады працавала паляводам у КСУП «Хвінявічы».  За дасягненні ў працоўнай вытворчасці  неаднаразова ўзнагароджвалася Ганаровымі граматамі і каштоўнымі падарункамі.



# Успаміны сведкаў вайны

## Успаміны сведкаў вайны

У кнізе “Памяць” мы знайшлі ўспаміны уцалеўшага жыхара вёскі Івана Іосіфавіча Павачка [2; 131]:

«*Перш чым пачуць стрэлы*, - успамінае Іван Іосіфавіч Павачка, *- я адчуў, што мне апякло пальцы на левай руцэ. Спачатку не ўцяміў, што такое. Потым чакаю новых стрэлаў, а іх няма і няма... Вакол стогнуць людзі. Раптам чую голас Міхаські: «Ой, татка, мне ў галоўцы баліць...» Толькі я паспеў сказаць: «Цярпі, сынок, хутка перастане балець», як ударыла новая чарга. Тут я хацеў паварушыцца, каб зірнуць на сыночка, але здранцвелае цела не слухалася. Тады я паклікаў: «Міша, Міша! Ты жывы?» Хлопчык маўчаў. Левы бок пачало заліваць нечым цёплым. Гэта была Міхаськава кроў. Трэцяя чарга. Куля рванула паясніцу. У гарачцы я павярнуўся на бок... Павярнуўся, і цяпер шкадую аб гэтым. Лепш бы мне ляжаць нерухома, тады б я не бачыў пакут сваіх блізкіх. Павярнуўшыся, я ўбачыў, як б'ецца аб зямлю жонка. Побач з ёю, закінуўшы ўгору акрываўлены тварык, ляжыць дачка. Я было памкнуўся да іх, але новы страшэнны боль у правай назе ўстрымаў мяне. Нейкі час яшчэ чуў стогны людзей, асобныя стрэлы, якімі карнікі дабівалі тых, хто ўзнімаўся на ногі. Потым праваліўся ў цёмную бездань. Калі ачнуўся, адчуў, што стала дужа горача. Не хапае паветра. Пава- рушыўся, паспрабаваў*

*прыўзняцца. За каўнер пасыпалася зямля, свежы струмень паветра надаў сілы, іх ханіла, каб выбрацца з магілы.*

*Калі выбраўся з ямы, то здзівіўся: ноч, а зямля белая... Спачатку падумаў, што здалося. Не, зямля сапраўды была белая. Памацаў рукой - снег! Нясцерпна пякло ў грудзях. Тварам уткнуўся ў снег, пачаў яго есці.*

*Пачынала світаць. Трэба было хутчэй уцякаць з гэтага страшнага месца. Мне здавалася, што карнікі абавязкова ўбачаць мяне і даб'юць. Намагаючы апошнія сілы, пасунуўся па пульхным снезе ўбок Казённага лесу. Паўзу, а перад вачыма акрываўлены тварык Ніны, у вушах слабенькі голас Міхаські: «Татка, баліць...»*

*Ранак застаў мяне далёка ў лесе. Ісці далей не было ўжо сіл. Я зарыўся ў снег і заціх».*



*Месцы расстрэлу жыхароў вёскі Вялікая Воля*

**СВЕДЕНИЯ О ПАМЯТНИКЕ:**

| | |
|---|---|
| Наименование памятника. Историческое событие, с которым связан памятник, и его дата. | Скульптура женщины и ребенка. Памятник 364 мирным гражданам жертвам фашизма в годы Великой Отечественной войны 1941-1945 гг. Расстрелены 16 декабря 1942 года. |
| Местонахождение памятника (точный адрес и топографическое расположение). | д. Б. Воля, Рудояворского сельского совета, Дятловского района, Гродненской области. заходнея окраина диревни. |
| Время сооружения памятника. | 1961 год. |
| Состоит ли памятник под государственной охраной (чьим решением утвержден, номер, дата). | /не состоит./ Состоит. Решение исполкома Гродненского областного Совета народных депутатов № 91 от 24 марта 1986 года. |
| Составлен ли паспорт на памятник, и где он хранится. | паспорт не составлен. |
| Имеется ли мемориальная доска на памятнике и ее текст (для памятника-здания). | |
| Дата составления карточки и подпись лица, заполнившего карточку. | июль 1985 год. [подпись] |




Дата фотоснимка « II » июня 19

Помнік ахвярам фашызму ў годы ВАВ

## **Успаміны Аляксея Віктаравіча Ламака**

*Спыніўшы калону, карнікі нейкі час чакалі, што ім загадаюць рабіць далей. З кабін грузавікоў павыходзілі афіцэры. Яны нядоўга аб нечым раіліся з немцам у скураным паліто, потым накіраваліся да натоўпу. Выгляд іх быў спакойны: ніколі не падумаеш, што яны рыхтуюцца да такой крывавай расправы. Некаторыя карнікі бралі з кішэняў цукеркі і раздавалі іх дзецям. Адна цукерка дасталася мне, я аддаў яе сваёй малодшай сястры Валі.*

*Да калоны наблізілася восем салдат з вінтоўкамі. Моўчкі яны бралі з натоўпу па два мужчыны і вялі да ўзгорку, на якім раслі сосны. Праз некалькі мінут там грымелі выстралы, паветра раздзіраў страшэнны крык людзей.*

*Адзін за другім гучалі залпы. Вылюдкі спачатку распраўляліся з мужчынамі і падлеткамі, а жанчын і дзяцей пакуль што не чапалі. Плакалі дзеці, прарэзліва галасілі маці...*

- *Мяне і тату,* - расказвае далей Аляксей, - *павялі з шостай партыяй. Тата хацеў развітацца з Валяй, узяў яе на рукі, каб пацалаваць, але салдаты выхапілі дзяўчынку з рук. Валя заплакала. Я ўчапіўся мацней за бацьку. Маці памкнулася да мяне, напэўна, каб развітацца, але карнікі ўдарамі загналі ў натоўп. Больш я яе не бачыў...*

*На месцы, куды нас прывялі, мы ўбачылі забітых вяскоўцаў. Бліжэй да нас ляжалі ў крыві Восіп Чудзілоўскі, Рыгор Альховік, Ігнат, Уладзімір і Міхаіл Ламакі. Уладзімір яшчэ варушыўся. Снег па-ранейшаму буйнымі камякамі клаўся на забітых і адразу чырванеў. Нам загадалі класціся ў адзін рад з мёртвымі, тварам уніз.*

*Стрэлы мне здаліся моцнымі, нібы выбухі. Запахла гарэлым порахам. Я адчуў, як здрыгануўся тата. Нешта цёплае, ненрыемнае налілося мне за каўнер, на твар. Пачуліся стогны, крыкі. Людзі памíралі не адразу. Пасля залпу з вінтовак карнікі з пісталетамі ў*

*рукахабыходзілі і аглядалі забітых. Таго, хто мог яшчэ выжыць, дабівалі з пісталетаў, а астатніх пакідалі на цяжкія пакуты. Я чуў, як Іван Альховік прасіў салдат прыстрэліць яго, але каты прайшлі міма.*

*Забойцы наблізіліся да мяне. Я прыціх. Салдат нагой ткнуў у галаву. Увесь твар мой быў заліты крывёю. Побач ляжаў забіты мой аднагодак Ваня Чудзілоўскі, яго кроў і сцякала на мяне. Кат палічыў мяне мертвым і адышоў.*

*У таты былі прастрэлены грудзі. Ён намогся ўстаць на ногі, ды не змог. Тады ён закрычаў, колькі было сілы, каб яго дабілі, пазбавілі пакут.*

*Жывыя зайздросцілі мёртвым...*

*Скончыўшы абход трупаў, карнікі накіраваліся на новыя ахвяры. Я паварушыўся. Ты жывы, сынок? Пачуўся слабы татаў голас.*

*- Жывы, толькі страшна, - адказаў я.*

*– Сынок, - знясілена загаварыў тата. - Я паміраю... Ты ляжы спакойна. не варушыся. Можа, не прыкмецяць... Як сцямнее, выбірайся адсюль. Ідзі ў лес, жыві... У мяне ў кішэні сцізорык і запальнічка... Вазьмі, ты любіў з імі гуляць... Перадай...*

*Што каму перадаць, ён так і не дагаварыў, перашкодзіла смерць. Я яшчэ доўга чуў стрэлы, перадсмяротныя крыкі людзей, а потым страціў прытомнасць.*

*Я выбраўся з-пад трупаў і пацягнуўся да старога. Васіль быў паранены ў галаву, на твары і на барадэе застыла кроў. Пачынала цямнець. На белым снезе чарнелі плямы крыкі.*

## № 124 Акт о преступлениях, совершенных немецкими оккупантами в деревнях Козловщинского района

22 декабря 1943 г.

22 декабря 1943 года, спецкомиссия Ленинского отряда по учету злодеяний немецко-фашистских захватчиков по Козловщинскому району Барановичской области под председательством Коско Констанитина Ефимовича и членов комиссии Дружининского Афридиана Васильевича, Чернова Ивана Ивановича, Ступчик Елены Александровны, на основании показаний крестьян (путем опроса), установила следующие злодеяния.

15.12.42 года в деревне Трохимовичи, Рудояворского с/с сожжено 20 домов и 40 надворных построек, убито 155 человек. Крестьян Лагутико Казимира Петровича, Трохимовича Юльяна Егоровича били их до потери сознания, поломали им руки и когда они превратились в бесформенную массу мяса – расстреляли их. Трохимовича Александра – 65 лет и внучку его Гелю – 12 лет бросили живьем в костер – сожгли. Трохимович Юзефу – 8 лет немец посадил в грязь, отойдя на 10–15 метров, прицелившись некоторое время, застрелил ее. Всех расстрелянных и раненых крестьян собрали в одну кучу и забросали их гранатами, всю эту гнусную операцию проводили немцы, латыши и местная полиция.

А 16.12.42 года утром в этой же деревне поймали вернувшихся из лесу раздетых и босых Трохимовича Александра Петровича и Трохимовича Станислава Венидиктовича, завезли в Козловщину и там полиция устраивала им пытки, били их, а полициант из дер. Войневичи Пиронимского с/с резал их ножом – замучили насмерть.

16.12.42 года в деревне Великая Воля сожжено 25 домов, убито 263 человека, из них 22 семьи полностью убиты, предварительно согнали в одно место всех жителей, в том числе женщин, детей и стариков, убийство производили немцы и литовцы.

16.12.42 года в деревне Городки Подвеликовского с/с приехавший немецкий карательный отряд собрал жителей деревни, вывел их 200 метров за деревню, обвиняя в связи с партизанами, и 327 человек расстрелял из пулеметов, а затем после через 2–3 дня,

когда вернулись в деревню разбежавшиеся, приказали им зарыть расстрелянных.

17.12.42 года в деревню Дуборовщина Подвеликовского с/с приехал отряд немцев примерно в 150 человек, сожгли 23 дома и 46 надворных построек, кого захватили в деревне, не успевших убежать, каждого на месте, всего убили 33 человека, 5 человек арестовали и 5 человек увезли на работу в Германию.

17.12.43 года в деревню Новоселки Рудояворского с/с приехали немцы совместно с местной полицией: комендантом полиции Светлицким Адамом, полициантами Урбанович Александр, Мечник и др. По указанию этого коменданта и полициантов убили 45 человек, каждого убивали там, где захватывали. 15.12.42 года в деревне Малая Воля сожжено 66 домов, убито 30 человек, арестовано 2 человека, путем облавы взято и отправлено на работу в Германию 6 человек. 18.8.42 года в деревне Скрунди Подвеликовского с/с латыши сожгли 1 дом и убили 8 человек, сожгли 4 надворные постройки.

И в 63 деревнях сожжено 10 домов, убито 52 чел., арестовано 29 человек. Вывезенных на работу в Германию 507 человек, из них захвачено путем облавы 82 человека и 425 человек мобилизованных. В местечке Козловщина помещение н-средней школы используется под конюшню. 5 домов, в которых ранее помещались учреждения, также 4 сарая и 1 кузница разобраны на постройку бункеров. Всего сожженных домов 145, надворных построек 90, убито 919 чел., из них замучено 7 чел., арестовано 34 ч[ел.], вывезено на работу в Германию 518 чел.

Председатель комиссии Коско

Члены: Дружининский Чернов Ступчик